Л.С. Кажухоўская,
*аспірантка*

# АСАБЛІВАСЦІ ФУНКЦЫЯНАВАННЯ БАЗАВЫХ СІМВАЛАЎ У НАЦЫЯНАЛЬНА-МАСТАЦКАЙ КАРЦІНЕ СВЕТУ

Нішто так не аб'ядноўвае нацыю, як пэўная акрэсленасць светаўспрымання агульнай карціны свету, якая ўзнаўляецца, падсілкоўваецца яго мастацкай культурай. Усё гэта адлюстроўваецца і ўвасабляецца ў паняцці нацыянальна-мастацкай карціны свету (НМКС).

Нераспрацаванасць праблем, звязаных з гэтым надзвычай важным фактарам нацыянальна-культурнага жыцця, на жаль, відавочная. Часткова прычына гэтага ў арыентацыі айчыннай даследчыцкай думкі на вывучэнне сацыяльна-матэрыяльных фактараў як асноватворных. Духоўныя ж фактары, да ліку якіх належыць НМКС, разглядаліся як другасныя, а іх роля зводзілася да абмежаванага ўплыву на сацыяльна арганізаваную лучнасць.

Вывучэнне сучасных падыходаў да тыпалагізацыі карціны свету дазваляе ў першым набліжэнні вызначыць паняцці "нацыянальная карціна свету", "нацыянальна-мастацкая карціна свету". Пад нацыянальнай карцінай свету мы разумеем цэласную сістэму мастацка-вобразных уяўленняў аб рэчаіснасці, уласцівых нацыі або народу ў працэсе гістарычнага развіцця, якая ўзнікае на падставе сінтэзу мноства асобных карцін свету розных сацыяльных груп, што ўваходзяць у гэтую нацыю, і абумоўленую характарам, менталітэтам народа, яго нацыянальнай ідэяй. Пад нацыянальна-мастацкай карцінай свету мы разумеем сінтэз нацыянальнай і мастацкай карцін, што ўтвараецца ў выніку аб'яднання нацыянальнага мастацтва і светаўспрымання.

Пры фарміраванні нацыянальна-мастацкай карціны свету ўвогуле і беларускай мастацкай карціны свету ў прыватнасці ў якасці найбольш важных кампанентаў, якія аказваюць уплыў на структуру НМКС, вылучаюцца менталітэт народа, яго нацыянальны характар і звязаны з ім характар яго нацыянальнай ідэі, а таксама базавыя сімвалы, што ўплываюць на яго светаўспрыманне.

Усведамленне марфалагічнасці складаных культурных утварэнняў, паўтаральнасці асобных элементаў або іх камбінацый



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

у розных фрагментах культурнай традыцыі прыводзіць да неабходнасці выдзялення першаэлементаў, формаўтваральных канструктаў, якімі ў адносінах да менталітэту, на наш погляд, з'яўляюцца базавыя сімвалы беларускай нацыянальна-мастацкай карціны свету.

Базавыя сімвалы можна вызначыць як сімвалічныя структуры, што ўвесь час узнаўляюцца ў дадзенай культуры і забяспечваюць захаванне асноўных сэнсаў, а тым самым адзінства сэнсавага зместу культуры. Самі па сабе базавыя сімвалы складаюць сімвалічнае ядро культуры, выяўляюцца ў якасці стрыжнёвых кампанентаў, "апорных канструкцый" нацыянальна-мастацкай карціны свету і нацыянальнага менталітэту.

У кантэксце праблем, звязаных з тыпалогіяй базавых сімвалаў мастацкай карціны свету беларусаў, нас цікавіў змястоўны план архетыпічный карціны свету, арыентаванай на максімальную касмалагізаванасць, апісанне асноўных параметраў Сусвету — прасторава-часавых, прычынных, колькасных, персанажных і інш. Для аналізу гэтага складанага ў структурных адносінах комплексу мы прапанавалі тыпалогію базавых сімвалаў адначасова з выяўленнем іх міфічнага сэнсу, сувязей з міфічнымі ўяўленнямі, вераваннямі, абрадамі і рытуаламі. У якасці аб'екта аналізу намі абраны сімвалічныя інварыянты нацыянальнага космасу беларусаў (на матэрыяле касмалагічных уяўленняў), эталоны-сімвалы, якія рэпрэзентуюць гісторыка-прыродную прастору беларускай мастацкай карціны свету, устойлівыя формы яе культурнага ландшафту, раслінныя і зоаморфныя сімвалы, сімвалічную мадэль бытаабжывання свету беларуса.

Аналізуючы склад касмалагічных уяўленняў беларусаў і зыходзячы з таго, што адной з прымет этнічнай ідэнтыфікацыі з'яўляецца дамінантнасць абагульнення адной або некалькіх стыхій, мы прыйшлі да высновы, што ў мастацкай карціне свету беларусаў максімальнай сакралізаванасцю валодае архетып Зямлі. Знаходзячыся ў цэнтры гарызантальна-вертыкальнага падзелу свету, сімвал "зямля" асэнсоўваецца адначасова і як сіла нараджальная, крыніца энергіі, і як сіла паглынальная, смертаносная; ён сімвалізуе малую радзіму, род як сукупнасць жывых і мёртвых, увасабляе стыхію ўрадлівасці.

Разглядаючы эталоны-сімвалы, якія рэпрэзентуюць гісторыка-прыродную прастору Беларусі, мы вылучылі сімвалаўтваральныя элементы гарызантальнай (поле, дарога, рака, балота,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кола, квадрат) і вертыкальнай (камень, курган, крыж, дрэва, лес) праекцый. Дадзеная тыпалогія дазваляе аб'яднаць сімвалы-лакатывы ў прасторавую сетку каардынат, гэта наглядна пацвярджае тэзіс аб тым, што скрыжаванне гарызанталі і вертыкалі з'яўляецца характэрнай асаблівасцю прасторавага светаўспрымання беларусаў у адрозненне, напрыклад, ад рускай традыцыі, для якой характэрная бязмежнасць гарызанталі.

У аснову вегетатыўнай часткі тыпалогіі базавых сімвалаў беларускай карціны свету ўвайшлі расліны, якія выконваюць рэпрэзентатыўную функцыю і акумулююць асноўныя сюжэты і матывы, што фарміруюць тэкставую аснову міфалагічнай і мастацкай традыцый (дуб, вярба, бяроза, папараць-кветка, шыпшына і інш.).

Вывучэнне асноўных зоаморфных сімвалаў праводзілася намі на аснове тэорыі татэмізму, што дазволіла ўключыць у тыпалогію такія сэнсавобразы, як конь, воўк, мядзведзь, каза — сярод жывёл; бусел, зязюля — сярод птушак; певень — хатніх птушак; вуж, гадзюка — як спецыфічна земляробчыя татэмы. Аналіз міфічнага сэнсу вобразаў-сімвалаў жывёл паказвае, што асноўнай характарыстыкай іх, замацаванай у павер'ях і абрадах, з'яўляецца амбівалентнасць сімвалічнага зместу.

Кожны элемент матэрыяльнай культуры выкарыстоўваецца згодна з яго практычнай каштоўнасцю і ў якасці знака, сімвала. Аналізуючы дом і яго часткі, элементы адзення і ежы, мы імкнуліся паказаць, што сукупнасць утылітарных і сімвалічных якасцей вызначае семіятычны статус вышэйразгледжаных элементаў матэрыяльнай культуры і іх трывалае функцыянаванне ў міфапаэтычнай традыцыі беларусаў.

Разгледзім асаблівасці функцыянавання сімвалаў у міфалогіі, фальклоры і прафесійнай мастацкай творчасці.

Базавыя сімвалы міфалагічнай карціны свету ўзнікаюць у архаічным культурным асяроддзі першабытнага грамадства як заканамерны вынік сімвалічнай інтэрпрэтацыі рэальнай ўзаемасувязі чалавека з прыродай. Прадуцыраванне міфалагічных сімвалаў абумоўлена і заканамернасцямі адпаведнага этапу ў развіцці ідэальнага, паколькі на гэтым этапе яшчэ не выпрацаваны абстрактныя паняцці і адпаведныя ім знакавыя структуры мовы, а рэчаіснасць адлюстроўваецца ў канкрэтна-пачуццёвых вобразах і моўнай карціне свету, якая фіксуе адносіны паміж гэтымі вобразамі з дапамогай шматсэнсавых абазначэнняў. У гэтых умовах перанос значэнняў па аналогіі з



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чалавечых адносін на тыя, што кіруюць жыццём прыроды, палягчаецца галоўнай роллю ў ідэальных працэсах абагульнення і тыпізацыі ў спалучэнні з нераспрацаванасцю крытычных механізмаў мыслення, якія дазваляюць блакіраваць яго яўна фантастычныя вынікі. Міфалагічныя вобразы замацоўваюцца ў калектыўнай памяці першабытных супольнасцей і перадаюцца нашчадкам сродкамі архаічнага фальклору ў выглядзе апавяданняў аб продках і сінкрэтычных дзеянняў першабытнага мастацтва, якія ўключаюць спевы, танцы, магічныя абрады, рытуалы і інш.

Гістарычна першым актам, які папярэднічае фарміраванню міфалагічнай карціны свету, была архетыпізацыя. Яе сутнасць у тым, што на базе разнастайнага вопыту адносін людзей з праявамі прыроднага і чалавечага свету ў калектыўнай свядомасці сталі фарміравацца і замацоўвацца ўстойлівыя архетыпы гэтых з'яў. На базе разнастайнасці ўбачаных чалавекам лясоў фарміруюцца правобразы лесу як такога, навальніцы як такой, агню, дзяўчыны, якія ўвасабляюцца ў сімвалы і ў розных іпастасях пачынаюць функцыянаваць у культуры. Найважнейшымі ўмовамі пераўтварэння архетыпаў у міфалагічныя сімвалы з'явіліся магчымасць і патрэба ў шырокіх абагульненнях пры адсутнасці дастатковага развіцця абстракцыі. Потым на аснове архетыпізацыі і першаснай сімвалізацыі развіваюцца ўяўленні аб усеагульнай адухоўленасці прыроды, якая фарміруецца па аналогіі з чалавечай адухоўленасцю і з'яўляецца асновай ранняй міфалагічнай карціны свету. Наступны этап — раздваенне адухоўленых істот на кіруючы элемент — душу — і пасіўнае цела. У сваю чаргу кіруючы элемент — душа — інтэрпрэтуецца як дух. Духамі засяляюцца самыя розныя аб'екты прыроды. У міфалагічнай карціне свету, якая перадаецца сродкамі фальклорнай культуры, міфалагічныя вобразы і сімвалы функцыянуюць бессістэмна. Такімі ж застаюцца і раннія ўяўленні.

З узнікненнем ранніх цывілізацый з'яўляецца патрэба ў сістэматызацыі міфалагічнай карціны свету і яе трансфармацыі ў рэлігійную. Гэтая сацыяльная патрэба рэалізуецца дзеячамі рэлігійнай культуры (жрацамі) шляхам адбору, рацыянальнага сінтэзу і кадыфікацыі міфалагічных сімвалаў і рытуалаў, якія зводзяцца ў адзіную сістэму культу.

Рэлігійная карціна свету ахоўваецца дзяржавай і мяняецца ў адпаведнасці з дзяржаўнымі інтарэсамі, хаця і не без сур'ёзных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

канфліктаў паміж жрацамі і палітычнай уладай. Міфалагічныя сімвалы рэлігійнай карціны свету працягваюць існаванне ў пісьмовай культуры і афіцыйных рытуалах.

Фальклорная карціна свету ўбірае ў сябе міфалагічныя сімвалы, але трансфармуе іх у адпаведнасці са сваімі асаблівасцямі і заканамернасцямі. У якасці базавых сімвалаў тут з'яўляюцца вобразы герояў, якія ўвасабляюць народныя ідэалы. Асаблівасці функцыянавання сімвалаў у народнай культуры абумоўлены яе вусным характарам, масавасцю, імкненнем да максімальных даходлівасці, прастаты і выразнасці вобразных стуктур, злучанасці ў адной асобе выканаўцы і аўтара фальклорнага твора. Дэміфалагізацыя сімвалаў міфалагічнай карціны свету пры пераходзе ў фальклор абумоўлена іншымі крытэрыямі: імкненнем перадаць падзеі і гісторыі так, як яны бачацца народным асяроддзем, або стварыць нейкую ідэалізаваную ўпрыгожаную рэальнасць, якая ў адрозненне ад міфалогіі ўспрымаецца як фантастыка. Другасная міфалагізацыя пры гэтым не ўсведамляецца.

Шматвяковае развіццё прафесійнай літаратуры, мастацтва і мастацкіх карцін свету, якія базіруюцца на іх, стварае іншыя ўмовы функцыянавання сімвалаў. Выкарыстанне разнастайных сімвалаў міфалогіі і фальклору, якое рэгулюецца эстэтычнымі перавагамі эпохі і культурнага асяродку, спалучаецца з арыентацыяй творцаў мастацтва ў іх сімваланараджальнай дзейнасці на арыгінальнасць і навізну твораў, іх філасофскую глыбіню, здольнасць уразіць чытача, атрымаць поспех або ўвекавечыць сваё імя ў мастацтве. Разнастайнасць падыходаў, метадаў, індывідуальных карцін свету, якія сінтэзуюцца ў той ці іншай мастацкай карціне свету, у сукупнасці нараджае універсалізм выкарыстання сімвалічных формаў.

Найважнейшы гістарычны падзел функцыянавання сімвалаў у мастацкіх карцінах свету прыходзіцца на рубеж XVII—XVIII стст., калі рэалістычная новаеўрапейская плынь культурнага развіцця абуджае самарэфлексію культуры і дазваляе ўсвядоміць ролю міфалагічных сімвалаў у культурных кантэкстах. На думку Л.Баткіна, "адраджэнне — апошняя цэласная культурная сістэма, якая пабудавана на архетыпе, г. зн. на міфе" (*Баткин Л.* Ренессансный миф о человеке // Вопр. литературы. — 1971. — № 9. — С 116.). Гэта трэба разумець не ў сэнсе ўсвармання фантастычнай прыроды міфалагічных сімвалаў. Рэнесансны міф з яго адмысловым спалучэннем хрысціянства, антычнасці,

гратэску, магіі, рыцарскай легенды быў яшчэ міфалагічнай рэальнасцю мыслення. Рацыяналізм Асветніцтва ўзняў у міфалогіі і яе сімвалізаваных архетыпах права на ўяўленне рэальнасці самой па сабе; выкарыстанне міфаў у мастацкай творчасці стала ўспрымацца як фантастыка, а наданне рэальнасці міфалагічным элементам у тлумачэнні свету — як забабоны. З гэтага моманту міфічныя сімвалы функцыянуюць у мастацкіх карцінах свету, з усведамленнем іх умоўнасці.

У XX ст. адбываецца новая трансфармацыя мастацкай карціны свету, звязаная з пранікненнем мастацтва ў раней недасягальныя для назірання сацыяльныя, чалавечыя і псіхалагічныя светы. Гэтае пранікненне патрабавала выкарыстання ў мастацтве наватарскіх умоўных прыёмаў і адначасова архаічных матываў, рэміфалагізацыі мастацкага мыслення і інш. Сімвалізацыя мастацкіх карцін свету робіцца ўсё больш складанай і шматузроўневай.

Такім чынам, інварыянтны элемент нацыянальнай карціны свету ўзнаўляецца, рэалізуецца ў яе базавых сімвалах, якія ў сваю чаргу запазычваюцца і мадыфікуюцца ў НМКС у працэсе стварэння розных мастацкіх твораў. Гэтыя творы маюць адбітак індывідуальнасці аўтара, выяўляюць пошук найбольш адэкватнага, нефармальнага адлюстравання, які можа быць наватарскім, традыцыяналісцкім або тым і другім. Але якой бы ні была індывідуальная разнастайнасць стыляў, арыгінальных прыёмаў, падыходаў, усе яны так ці інакш адпавядаюць нацыянальна-мастацкай краціне свету сваёй эпохі, нават калі чымсьці вылучаюцца з агульных заканамернасцей гэтай карціны свету. Нават відавочныя запазычанні НМКС іншых народаў, калі не маюць штучнага характару і ў дастатковай ступені адаптаваны да нацыянальнага светаўспрымання, спрыяюць духоўнаму ўзбагачэнню. Так адбываецца таму, што творчасць кожнага мастака, які б арыгінальны, самабытны і не падобны на іншых ён ні быў, заўсёды мае перадумову: яна тысячамі ніцяў нябачна звязана з роднай культурай, з назіраннямі за чалавечымі паводзінамі, фарбамі роднага краю, творамі нацыянальнага мастацтва.

Такім чанам, можна дапусціць пэўную культуралагічную трансфармацыю юнгаўскага паняцця архетыпу і на яе аснове сфармуляваць шэраг палажэнняў, якія тычацца ўзаемапераўтварэння архетыпаў і сімвалаў у працэсе іх функцыянавання ў культуры. Агульнасць і калектыўнасць архетыпаў абумоўлена іх прыналежнасцю да пэўнай культуры, у якой увесь час адбываюцца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

перадача, запазычанне і замацаванне розных архетыпаў. Архетыпы, якія перадаюцца ад культуры да культуры, ад эпохі да эпохі ў выглядзе агульназначных і агульнаўжывальных сімвалаў, выступаюць як найважнейшыя элементы генетыкі, своеасаблівыя генатыпы культуры. Першаснае ўвасабленне архетыпа ў базавыя сімвалы адбываецца ў глыбокай старажытнасці ў архаічнай культуры. Потым новыя пакаленні запазычваюць і атрымліваюць у спадчыну гэтыя сімвалы разам з культурай, распаўсюджваюць іх у розных культурных асяродках, дзе сімвалы праходзяць адаптацыю і апрацоўку, захоўваючы архетыпічны змест. Менавіта ў гэтым плане архетыпы падаюцца ў якасці сацыякультурных варыянтаў. У іх фіксуецца і агульначалавечы змест культуры прадстаўнікоў розных лакальных цывілізацый, народаў і рас. У той жа час адны і тыя ж архетыпы ў працэсе ўвасаблення ў культуразначныя сімвалы напаўняюцца розным зместам у залежнасці ад карціны свету, у межах якой адбываецца іх функцыянаванне, сацыякультурных асаблівасцей цывілізацыі, народа або расы.

Базавыя сімвалы як апорныя пункты мастацкага мыслення, уяўлення, памяці не з'яўляюцца толькі фармальнымі кампанентамі карціны свету. З глыбінь мастацкага асяроддзя яны трапляюць у свядомасць і падсвядомасць кожнага чалавека, уплываюць на нацыянальны менталітэт. Яны па сутнасці перш за ўсё кампаненты нашай душы ў больш інтымныя моманты чалавечых перажыванняў, разважанняў аб радзіме, яе лёсе і лёсе чалавека. Базавыя сімвалы мастацкай карціны свету заўсёды афарбаваны любоўю да роднага краю, роднага кутка. Яны з'яўляюцца ўмоўнымі абазначэннямі або матэрыяльнымі выяўленнямі гэтай любві. Злучаныя з нацыянальна-мастацкай карцінай свету, гэтыя сімвалы ўвесь час падсілкоўваюць мастацтва перш за ўсё за кошт нацыянальнага настрою кожнага мастака.

Базавы сімвал уяўляе канкрэтную выяву тых або іншых ідэй і ідэалаў як вышэйшых каштоўнасцей і сэнсаў, якія абумоўліваюць развіццё і функцыянаванне культуры. Увасабляючы вышэйшыя духоўныя пласты культуры, сімвал займае цэнтральнае месца ва ўсім комплексе знакавамоўных сродкаў культуры.

Аднаўленне страчанай гістарычнай памяці магчыма толькі пад уздзеяннем інтэнсіўнага развіцця і магутнай экспансіі гуманітарнай культуры, якія могуць ажыццяўляцца культурнай элітай і звязаны з адраджэннем памяці культуры, увасобленай у базавых сімвалах.